# Тэатралізаванае прадстаўленне

**“Святое вялічка ды гуляць вяліць з красным яечкам”**

**МЭТА: далучэнне вучняў да нацыянальных традыцый народнага календара беларусаў**
**Задачы:**
- сфарміраваць уяўленне вучняў аб своеасаблівым моманце свята Вялікадня - прыходзе валачобнікаў, об сімвалічным значэнні фарбаваных яек-крашанак і яек-пісанак;
- развіваць творчыя здольнасці вучняў на падставе элементаў тэатралізаванага абыгрывання свята Вялікадня;
- выхоўваць павагу да роднага беларускага слова, народнага свята

***АБСТАЛЯВАННЕ:***
- фарбованыя яйкі-крашанкі, яйкі-пісанкі, збожжа, тры карзінкі, абрус, стол, лавы, выява сонца, образ Божай Маці для Чырвонага кута , пасхальны пірог (куліч).

***(У стылізаваным пад сялянскую хату пакоі (трысцен) стаіць печ, акно з занавескамі, лавы, стол, засланы абрусам. Тры карзіначкі з яйкамі.)***

***Досвітак. На ўсходзе сонца дня Вялікадня.***

**<u>Цётка Ганна</u>:** Чырвонае кока ўжо недалёка
Каліна-маліна , ягадзіца
Цыбульку лупіці, яечкі хфарбіці
Каліна-маліна , ягадзіца
Яечкі хварбіці, хлопчыкам дзяліці
Каліна-маліна , ягадзіца

Вось і надышло жаданае і чаканае свята - Вялікдзень. Зайграла сонейка, заструменіла сваімі праменьчыкамі. Вось і дачакаліся свята абуджэння прыроды, надыходу "вялікдзён" палявых работ.

**<u>Дзед Іван:</u>** Пасля зімовага адпачынку людзі будуць сеяць, палоць, касіць, жаць. А яшчэ да гэтага свята прымеркавана "Уваскрашанне ўкрыжаванага Хрыста".

**<u>Цётка Ганна:</u>** Загаварыліся мы з табой, а я і забылася твар памыць. Вось зараз па традыцыі ў гэты дзень вазьму вадзіцы з крыніцы, пакладу туды золата, серабра, чырвонае яйка, памыюся - і адразу памаладзею, яшчэ багацей стану за год. І ты ад мяне не адставай.

**Дзед Іван:** А я яшчэ акуратна валасы прычашу, бо ў нашай мясцовасці ж гавораць: "Колькі на галаве валасоў, няхай столькі будзе ўнукаў".

**Цётка Ганна:** Так, так… Ды будзем на стол збіраць святочнае снеданне.

***(Мыюцца, накрываюць на стол) Стук у дзверы, заходзяць унукі.***

**Унукі:** Хрыстос уваскрос!(3 разы)

**Цётка Ганна:** Сапраўды ўваскрос (тройчы цалуюцца). Адкуль вы так ранютка?

**Унук:** А мы з мамай на ўсяночную хадзілі, стравы свянцілі.

**Унучка:** Вось і вам мама свянцонага перадала.

**(Дастае з карзіны пірог, яйкі, мяса, мёд)**

**Цётка Ганна:** Дзякую, унучачкі. А людзей многа ў царкве было?

**Унучка :** Вой, многа.
**Цётка Ганна:** Дык і ў мінулую, у вербную нядзелю, таксама многа было. Яж хадзіа у царкву вярбу свенціць. А давайце свянцонае яйка пакрышым. Насыпай ўнучка солі.
**Унучка**. Ой, паглядзіце. Як сонца прыгожа іграе. Так толькі на Вялікдзень бывае.
**Цётка Ганна:**
**Існуе павер'е, нібыта на першы дзень Вялікадня іграе сонейка. Струменіць сваімі праменьчыкамі. Гэта свята ў гонар сонца, абуджэння прыроды, надыходу вялікіх дзён палявых работ. Пасля зімовага адпачынку людзі пачнуць араць, сеяць, палоць, касіць. А яшчэ гэта хрысціянскае свята у гонар уваскрашэння ўкрыжаванага Хрыста.**
Свяці-свяці сонейка, каб нам было цёпленька
Ай, люлі, люлі, люленькі-люлі.
Пад хатаю седзячы лусту хлеба дзержачы,
Ай, люлі, люлі, люленькі-люлі.
Яечкі качаючы, песенькі спяваючы
Ай, люлі, люлі, люленькі-люлі.
Свяці-свяці сонейка, каб нам было цёпленька
Ай, люлі, люлі, люленькі-люлі.
Ай, люлі, люлі, люленькі-люлі.

**Унучка**. –Ой, як у вас смачна пахне!

**Цётка Ганна:** Перш, дзеткі, чым есці, памыйцеся адварам, у якім я яйкі фарбавала.

**Унукі:** А для чаго гэта?

**Цётка Ганна:** А каб хваробы не баяліся. Мыйце тварыкі свае светлыя, каб вашы шчочкі былі ружовымі, а жыццё - чыстым і празрыстым, як крынічка лясная.
Ну вось, вочкі засвяціліся радасцю, можна і да стала. На Вялікдзень заўседы гатуецца шмат усялякіх смачных страў. Але перш трэба адведаць святочную страву: свянцонага яйка, хлеба ды солі. Частуйцеся.
***(Сядаюць за стол, частуюцца)***
Унучкі:– Вой, як смачна.
**Унучка:** А да вас сёння госці прыйдуць?
**Цётка Ганна:** А як жа… Цётка Міхаліна з Максімам пірог прынясуць, я ж іх дзіця купала. Ды і валачобнікі , напэўна, прыйдуць.
**Унучка. Цетка Ганна, я ад бабулі чула, што** існуе такое павер'е: косці ад святочнага стала патрэбна сабраць ды закапаць у зямлю, прыгаворваючы ***"Закопваем у табе косцейкі, зямліца. каб быў добры ўраджай і не пабіў пасевы град".***
**Цётка Ганна: З Вялікадня зязюля першы раз кукуе.**
**Унучка.Птушачкі пачынаюць пець.**
**Унук:** Ой, я ўжо падсілкаваўся, як след. А давай, Аленка, у біткі пагуляем.
**Аленка:** Давай.
**Дзед Іван:** Пагуляйце, унучкі, пагуляйце,
Але спачатку моц яек паспытайце.
Як гэта робіцца - не трэба саромецца:
Спачатку аб зубкі пастукайце,
Тады да вушка прыкладзіце - паслухайце.
Калі яечка гудзе – значыць, моцным будзе.
А калі не, значыць, нехта разаб'е.

**Унук:** Будзем біць яйкі?

**Аленка:** Будзем, але дай найперш паспрабаваць

***(абменьваюцца яйкамі і спрабуюць асцярожна на зубы)***

-Нешта, брат, тваё дужа крэпкае, ці ж не фальшывае?

**Унук:** А тваё крапчэй. Давай мяняцца.

**Алена:** Не, не хачу мяняцца.

**Унук:** То трымай, буду біць.

***(паспрачаўшыся, б'юцца яйкамі)***

**Чуецца музыка. Заходзяць валачобнікі:**

*Песня:Валачобныя. Людзі добрыя!Хрыстос уваскрэс на ўвесь свет!*
*Валачыліся. Намачыліся, Хрыстос уваскрэс на ўвесь свет1*
*Да вашай хаты прыблудзіліся  Хрыстос уваскрэс на ўвесь свет*
*Дайце нам сала. Каб хазяйства стала Хрыстос уваскрэс на ўвесь свет*

Вадачобнік.    Ішлі, прыйшлі валачобнікі,
Іграючы ды спяваючы,
Добрых гаспадароў вітаючы!
Добры дзень, пані гаспадыня!
Ці спіш, ці не спіш, пані гаспадыня?
Калі ж спіш, Бог з табою.
Калі ж не спіш - ходзь са мною.
Чуеш? Святое Вялічка з красным яечкам!

Добры дзень, пані гаспадыня. Твая ніва тожа урадліва.

Чаго не пасееш. То ўсяго маеш:авёс, ясмень ,грэчка, з кожнай капы –- бочка. Картопля і цыбуля–як гарматна куля. Жыта і пшаніца ды ўсякая пашніца.Мы вас віншуем ды шчасця жалуем.

**Другі:** Дай Божа, пані гаспадыня,
Табе і тваім гасцям,
Каб вы пілі, елі,
Вясёленька сядзелі,
Добрыя думкі мелі.

**Першы** :Ото не, гаспадыня. Песня спета проці лета. А будзь жа вясёлай, як вясна-красна .А будзь  жа ціха, як ціха лета. А будзь жа  багата, як багата восень А ты, гаспадыня, сама здагадайся: патэльню ў печ, па яечкі –у клецьǃСала прыхапі, прынясі нам каўбасы з шасток ды свінню з хвастом.

**Цетка Ганна**:Няма чаго даваць. Сама хутка пайду жабраваць.

**Другі:** Не скупіся, гаспадыня! Некалі заможна жыла, усякага дабра займела, а цяпер паскупела. Гаспадынька-журавінка! Адары нас, не мары нас1

**Цетка Ганна: Вось вам за гэта пяток яек, канец пірага. Акраец хлеба, варанага мяса, кавалак сыру ды ідзіце сабе з богам да друога двара.**

**Трэці:** Дзякуй гаспадыня за пшонны піражок.
А дзякуй гаспадыня  табе за добрыя дары
Каб дажыць да лета ды лепей за гэта.
Дай,божа, каб вам шчаслiва жылося ды багацце вялося
У полі – уродзіста, у клеці – насыпіста
у гумне – накладзіста, у дзяжы- падыходзіста, на стале –уедзіста. І вас пачастуем велікоднымі пірагамі.

**Цётка Ганна:** Час ужо і заспяваць, святочныя віншаванні сказаць

**<u>Валачобнік:</u>**

Дык чаго ж  не сказаць?
Ёсць што сказаць:
Гаспадар паважаны,
Людзьмі шанаваны
Шмат дабра мае,
Чужога не спажывае.

**Спяваюць песню "Вялікдзень"**

Да была ж  ў бабкі
Курка-каралеўна
Куд-кудах, куд-кудах на заўтра з яйцом
Да знясла жа бабцы залато яечка
Куд-кудах, куд-кудах на заўтра з яйцом
Да прыйшлі жа к бабцы валачобнічкі
Куд-кудах, куд-кудах на заўтра з яйцом
Валачы –ы- ліся, зрасі- і-і=ліся .
Куд-кудах, куд-кудах на заўтра з яйцом
Да прйшліся к бабцы, асушылі-і-ся,
Куд-кудах, куд-кудах на заўтра з яйцом
Да далаж ім бабка залаты яечкі
Куд-кудах, куд-кудах на заўтра з яйцом
Куд-кудах, куд-кудах на заўтра з яйцом

**<u>Цётка Ганна:</u>** Слаўна, валачобнікі, спяваеце, гаспадароў велічаеце.

**<u>Валачобнікі:</u>** Дзякуй, цётачка!
Свяці-свяці сонейка, каб нам было цёпленька
Ай, люлі, люлі, люленькі-люлі.
Пад хатаю седзячы лусту хлеба дзержачы,
Ай, люлі, люлі, люленькі-люлі.
Яечкі качаючы, песенькі спяваючы
Ай, люлі, люлі, люленькі-люлі.
Свяці-свяці сонейка, каб нам было цёпленька
Ай, люлі, люлі, люленькі-люлі.
Ай, люлі, люлі, люленькі-люлі.

**<u>Цётка Ганна:</u>**. Дзякуй за песню годную. Дазвольце ж і мне вас ушанаваць.(Падносіць карзіну з чырвонымі яйкамі.) Прыміце, паважаныя госцейкі, чырвоныя крашанкі - яйкі, каб у душы кожнага з вас радасць пасялілася без утайкі.

**<u>Цётка Гана:</u>** (падносячы другую карзіну  з яйкамі-пісанкамі):

Прыміце яйкі з рыбкамі,
Каб увесь год здароўе чэрпалі міскамі.

Прыміце яйка з лісточкам дубовым,
Каб сіла і даўгалецце напаўнялі вас пахам мядовым.

Маладым дзевачкам, красным малодачкам
Па яйку з макавым цветам,
Як сімвал вечнай маладосці і дзявочай прыгажосці.

**Валачобнікі:** Дай табе, Божа, шаноўная гаспадынька, таксама доўга жыці і здаровай быці… Ну, а мы аддзячым Вам песняй. Гэй , народ, станавіся ў карагод!

**Вялікдзень" (на мелодыю песні "Вясна-красна на ўвесь свет")**
**А ў лесе, лесе, ды на верасе-**
**Вясна-красна на ўвесь свет**
**Малады там хлопчык, ды валы пасе**
**Вясна-красна на ўвесь свет**
**А яму дзяўчынка ды абед нясе**
**Вясна-красна на ўвесь свет**
Сядзьма разам,хлопчык, паабедаем,
**Вясна-красна на ўвесь свет**
А я па абедзе скажу табе дзіва
**Вясна-красна на ўвесь свет**
Скажу табе дзіва найдзіўнейшае
**Вясна-красна на ўвесь свет**
Гэтаю вясною пабярэмося
**Вясна-красна на ўвесь свет**
Мужам і жаною застанемося
**Вясна-красна на ўвесь свет**

**(Заходзіць гаспадыня ў круг з карзінай, у якой зерне з белымі нефарбаванымі яйкамі, дастае яйка , паказвае і дорыць карзіну)**

**Цётка Ганна:** Дару вам карзіну са збожжам і яйкамі,
Каб жыта цудоўна радзіла і шчаслівае жыццё гаманіла

Ідзём-пайдзём вдоль вуліцы
Спявайце, братцы, свпявайце
Вдоль вуліцы ў дзяўчынскі двор
Спявайце, братцы, спявайце
Дзяўчынскі двор на сем вакон
Спявайце, братцы, пявайце
Добры вечар, дзяўчыначка,
Спявайце, братцы, спявайце
Ці спіш, ляжыш, спачываеш
Спявайце, братцы, спявайце
Калі ты спіш, устань з ложку,

Спявайце, братцы, спявайце
Усань з ложку, абуй ножку
Спявайце, братцы, спявайце
Прычашыся гладзюсенька,
Спявайце, братцы, спявайце
Ды падыдзі блізюсенька
Спявайце, братцы, спявайце